PolotskSU

УДК 334.735(476-15)(091)“1920/1939”

# ПОЛЬСКІ КААПЕРАТЫЎНЫ ЗАКОН 1920 Г. І ЯГО ЎПЛЫЎ НА РАЗВІЦЦЁ ЗАХАДНЕБЕЛАРУСКАГА КААПЕРАТЫЎНАГА РУХУ

***А.Л. Радзюк,***
*дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, кандыдат гістарычных навук*

Кааперацыя была адметнай з’явай у гаспадарчым жыцці Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд. Акрамя эканамічнай дзейнасці, кааператывы праводзілі актыўную культурную працу, накіраваную на захаванне і пашырэнне нацыянальнай свядомасці беларускага насельніцтва.

Развіцце беларускага заходнебеларускага руха адбывалася на падставе польскага закону аб кааператывах, які быў прыняты Сеймам 29 кастрычніка 1920 г. (далей – закон) Паводле меркаванняў некаторых даследчыкаў, дадзены заканадаўчы акт быў адным з самых прагрэсіўных у сферы прававой рэгламентацыі кааперацыі ў тагачасным свеце [1, s. 62].

У законе падавалася вызначэнне тэрміна “кааператыў” і фармуляваліся агульныя прынцыпы кааперацыі. Характэрнай рысай была тое, што кааператарам давалася магчымасць правядзення працы з мэтай павышэння “культурнага ўзроўню” членаў [2]. Гэта спрыяла актывізацыі адукацыйнай і культурнай дзейнасці сярод прадстаўнікам кааператыўнага руху нацыянальных меншасцяў.

Працэдура заснавання і рэгістрацыі кааператыву, у параўнанні з кааператыўным заканадаўствам Расійскай імперыі, была нескладанай. Для гэтага трэба было падаць у акружны суд статут, дзе агаворваліся асноўныя арганізацыйныя прынцыпы і гаспадарчыя мэты таварыства. Пасля разгляду статуту судом і Міністэрствам фінансаў кааператыў на працягу 2 месяцаў рэгістраваўся і мог распачынаць гаспадарчую дзейнасць. Закон дэталізаваў умовы членства ў кааператывах, рэгламентаваў правядзенне рэвізій і дзейнасць рэвізійных саюзаў. Таксама былі вызначаны органы кааператываў і акрэслены іх функцыі [3, s. 25-26].

Асобная роля належыла Кааператыўнай радзе (далей – Рада). Яна была створана 14 снежня 1920 г. пастановай Міністэрстваў фінансаў і Міністэрства юстыцыі Польшчы і выконвала функцыю своеасаблівага злучніка паміж урадам і кааперацыяй [4, s. 30]. Для беларускага кааператыўнага руху роля гэтай інстытуцыі была надзвычай высокай. Калі ў саюзных кааператывах канчатковыя гадавыя рэвізіі праводзіліся адпаведным рэвізійным саюзам, то ў незалежных кааператывах (большасць беларускіх гаспадарчых арганізацый належалі менавіта да гэтай групы) гэта функцыя адводзілася Радзе. Паводле арт. 117 закону 1920 г. Рада магла распачаць працэдуру ліквідацыі кааператыва, ці саюзу кааператываў [5, s. 37]. Акрамя таго незалежныя (“дзікія”) кааператывы павінны былі: 1) штогод прысылаць справаздачы агульных сходаў і пасяджэнняў наглядней рады; 2) плаціць грошы за правядзенне канчатковай рэвізіі (раз у два гады);

3) кожны год абвяшчаць свой баланс у прэсе; 4). плаціць грошы за апрацоўку балансаў [6, л. 16].

Характэрна, што кансерватыўныя колы польскага кааператыўнага руху абвінавачвалі закон у празмерным грамадскім радыкалізме і дэмакратызме [3, s. 31]. Менавіта яны ініцыявалі  кампанію за рэфармаванне кааператыўнага заканадаўства ў прэсе. Іх галоўныя патрабаванні можна звесці да наступных пунктаў: 1) павышэнне ролі дзяржавы ў кіраўніцтве; 2) ліквідацыя кааператыўнай рады; 3) няроўнасць галасоў для сяброў усіх кааператываў; 4) павышэнне ролі акруговых судоў у адносінах да кааперацыі. На базе гэтых прэтэнзій у 1925 г. быў падрыхтаваны альтэрнатыўны праект закона аб кааперацыі [7, s. 56]. У рэшце рэшт на пачатку 1930–х гг. нападкі з боку санацыйнага рэжыму і буйнога прыватнага капіталу прывялі да рэфармавання ўсёй кааператыўнай сістэмы.

У 1934 г. былі прыняты змены у кааператыўны закон, згодна з якімі уся тэрыторыя тагачаснай Польшчы была падзелена на акругі, дзе маглі дзейнічаць толькі буйныя рэвізійныя саюзы [8]. Для беларускіх кааператываў дадзенае палажэнне пакідала толькі два варыянты магчымай дзейнасці: 1) у межах польскіх рэвізійных саюзаў, што фактычна азначала інкарпарацыю ў польскую кааператыўную сістэму; 2) заставацца “дзікімі”, г. зн. не ўваходзіць у рэвізійныя саюзы і плаціць вялізныя падаткі. Таксама закон прадугледжваў павышэнне ролі мясцовай адміністрацыі пры рэгістрацыі кааператыва. Тая, у сваю чаргу,  з вялікай неахвотай дазваляла заснаваць беларускі кааператыў [8; 9, л. 3].

Пазней былі абмежаваны паўнамоцтвы Рады. Яе новая роля і стаўленне да “дзікай” кааперацыі былі акрэслены на ІІІ канферэнцыі рэвізораў Кааператыўнай рады 2-3 верасня 1935 г. Адзін з кіраўнікоў рады Т. Клапкоўскі паміж іншага адзначыў: “Рада больш не жадае быць сурагатам рэвізійнага саюзу для “дзікіх” кааператываў, таму ўся ўвага Бюро (кіраўніцтва рады – А.Р.) будзе скіравана на тое, каб весці развітыя кааператывы да ўступлення ў рэвізійныя саюзы, а неразвітыя кааператывы і псеўда-кааператывы ліквідаваць” [9, л. 5].

Такім чынам, у міжваеннае дваццацігоддзе заканадаўчая база дзейнасці беларускіх кааператываў у Польшчы перажыла пэўную эвалюцыю. Польскі закон аб кааператывах ад 29 кастрычніка 1920 г. у цэлым насіў дэмакратычны характар і даваў шырокія магчымасці для развіцця кааперацыі. Аднак, ён распаўсюджваўся на беларускі кааператыўны рух праз мясцовую адміністрацыю, якая парушала яго прынцыпы і часта не дазваляла адкрываць кааператывы па палітычных матывах. Абноўлены пры санацыйным рэжыме закон аб кааператывах быў пазбаўлены ранейшых прынцыпаў дэмакратычнасці і адкрытасці, узмацняў кантроль дзяржавы над кааператыўнымі таварыствамі. Галоўным вынікам заканадаўчых змен для кааператараў Заходняй Беларусі стала немагчымасць існавання без прыналежнасці да якога-небудзь рэвізійнага саюзу. А так як уласнага саюзу ў беларускіх кааператараў не было, гэта азначала паступовае ўключэнне ў польскую кааператыўную сістэму.



PolotskSU

PolotskSU

***Спіс выкарыстаных крыніц:***

1. Piechowski, A. Wkład spółdzielczości w odzyskanie niepodleglości / A. Piechowski // Spółdzielczość w budowie społeczeństwa obywatelskiego. – historia i współczesność. – Warszawa : Muzeum Niepodległości, 2013. – S. 49–62.
2. Dziennik Ustaw Rzeczypospospolitej Polskiej. —111. — Poz. 733. — Ustawa z dnia 29 października 1920 r. O spółdzielniach.
3. Rusiński, W. Zarys historii polskiego ruchu spółdzielczego (część II 1918-1939) / W. Rusiński. – Warszawa: Zakład wydawnictw CZSR, 1980. — 355 s.
4. Chyra-Rolicz, Z. Z tradycji polskiej spółdzielczości II Rzeczypospolitej: idee, fakty, dokonania / Z. Chyra-Rolicz – Warszawa : Polski Dom Wydawniczy „Ławica”, 1992. — 102 s.
5. Wrzołek-Romańczuk, M. Model nadzoru nad spółdzielniami i ich lustracji / M. Wrzołek-Romańczuk // Kierunki zmian prawa spółdzielczego w Polsce –Warszawa: Kancelaria Senatu, 2014. – S. 35– 47.
6. Архіў новых актаў у Варшаве (АНА) Ф. 213. Каапэратыўная рада (КР). – Адз. зах. 18384.
7. Kędziorek, F. Spółdzielczość w zaryse / F. Kędziorek. – Warszawa: Wyd. Spółdzielcze, 1988. — 157 s.
8. Dziennik Ustaw Rzeczypospospolitej Polskiej. — №38. — Poz. 342. — Ustawa z dnia 13 marca1934 r. w sprawie zmiany ustawy o spółdzielniach. – S. 635–641.
9. АНА. – Ф. 213. КР. – Адз. зах. 74